**ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

на правах рукапісу

УДК 370.17.044.3

ПАШКЕВІЧ
Уладзімір Вячаслававіч

# ФАРМІРАВАННЕ МАРАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ ВУЧНЯЎ 5 - 7 КЛАСАЎ СРОДКАМІ ВУСНАЙ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

13.00.01 - АГУЛЬНАЯ ПЕДАГОГІКА

Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

ВИТЕБСКИЙ
государственный педагогический институт
С. М. КИРОВА
БИБЛИОТЕКА

Навуковы кіраўнік -
член - карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт ГРЫМАЦЬ А.А.

Віцебск 1996

## ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ........................................................................................ 3

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ............................................ 6

І. ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ФАРМІРАВАННЯ МАРАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ ПАДЛЕТКАЎ

1.1. Сутнасць маральных каштоўнасцей і маральных каштоўнасных арыентацый........................................................................................ 11

1.2. Адлюстраванне маральных каштоўнасцей беларускага народа ў розных жанрах фальклору........................................................................................ 26

1.3. Узроўні сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў........................................................................................ 41

ІІ. ПРАЦЭС ФАРМІРАВАННЯ МАРАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ ВУЧНЯЎ 5- 7-х КЛАСАЎ У ВУЧЭБНАЙ І ПАЗАКЛАСНАЙ РАБОЦЕ

2.1. Факультатывы па вуснай народнай творчасці ў сістэме фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў........................................ 69

2.2. Развіццё пачуццёва-эмацыянальнай сферы школьнікаў у працэсе вывучэння фальклору як умова глыбокага ўсведамлення імі сутнасці маральных каштоўнасцей беларускага народа........................................ 84

2.3. Дзейнасны падыход да фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў сродкамі вуснай народнай творчасці........................ 93

ВЫВАДЫ........................................................................................ 108

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ................................................ 110

ДАДАТАК 1 ........................................................................................ 122

ДАДАТАК 2 ........................................................................................ 131

ДАДАТАК 3 ........................................................................................ 137

ДАДАТАК 4 ........................................................................................ 141

ДАДАТАК 5 ........................................................................................ 144

ДАДАТАК 6 ........................................................................................ 146

# УВОДЗІНЫ

Змены ў палітычным, эканамічным, грамадскім жыцці краіны ставяць новыя мэты выхавання, патрабуюць новых арыентацый у гэтым працэсе, духоўнага і маральнага змянення асобы, што магчыма толькі на падставе тэарэтыка-каштоўнаснага падыходу. Сёння працэсу фарміравання ўнутраных матываў рэгуляцыі паводзін, дзейнасці і яго цэнтральнаму звяну- сістэме каштоўнасных арыентацый маральнай свядомасці школьнікаў- надаецца вялікая ўвага. Глыбокае даследаванне гэтага пытання з улікам сучасных патрабаванняў дасць магчымасць зняць многія складаныя праблемы маральнага выхавання, пераадолець цяжкасці і супярэчнасці, якія паўстаюць на шляху маральнага станаўлення і развіцця асобы.

Праблема каштоўнасцей, у тым ліку маральных, маральных каштоўнасных арыентацый з'яўляецца аб'ектам даследавання філосафаў, сацыёлагаў, псіхолагаў, педагогаў з даўніх часоў. У сваіх працах даследчыкі раскрылі змест, сутнасць паняццяў "маральныя каштоўнасці", "маральныя каштоўнасныя арыентацыі", далі тэарэтычнае абгрунтаванне маральных каштоўнасных арыентацый як інтэгратыўнага ўтварэння, што характарызуе асобу, яе накіраванасць (Б.Б.Альшанскі, Л.М.Архагельскі, У.А.Блюмкін, Д.І.Вадзінскі, А.А.Грымаць, А.Р.Здравамыслаў, В.П.Тугарынаў, К.А.Шварцман, А.Ф.Шышкін, У.А.Ядаў і інш.).

У сувязі з вырашэннем задач сацыялізацыі асобы школьніка вялікая ўвага стала надавацца працэсу фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый і метадам яго ажыццяўлення (Д.І.Вадзінскі, К.У.Гаўрылавец, А.А.Грымаць, І.І.Казімірская, І.Ф.Харламаў і інш.). Працэс фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый адбываецца на працягу ўсяго жыцця. Але, трэба адзначыць, што найбольш інтэнсіўна ен працякае ў падлеткавым узросце, гэта значыць, у той час, калі закладваюцца асновы маральнай свядомасці, фарміруюцца маральныя ідэалы, асэнсоўваюцца маральныя нормы, прынцыпы, складваецца сістэма ведаў і ацэначных меркаванняў, інтэнсіўна ідзе працэс развіцця пачуццёва-эмацыянальнай сферы. Мараль, як вядома, перадаецца ад пакалення да пакалення ў выглядзе масавай звычкі і падтрымкі грамадскай думкай пэўных маральных норм і прынцыпаў. Узровень псіхічнага развіцця падлеткаў дазваляе на аснове грамадскай маралі актывізаваць працэс самарэгуляцыі паводзін, удасканаліць ацэнку паводзін іншых з пункту погляду агульначалавечай маралі. Важную ролю пры гэтым адыгрывае працэс навучання (Л.І. Бажовіч, Л.І. Рувінскі, П.М. Якабсон).

Працэсу фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў у вялікай ступені садзейнічае пазнанне школьнікамі маральных ведаў. У шматлікіх

псіхолага-педагагічных працах падкрэсліваецца значымасць працэсу набыцця і прымянення вучнямі маральных ведаў у цеснай еднасці з пэўнымі відамі дзейнасці (З.І.Васільева, Л.І.Рувінскі, І.Ф.Харламаў). Не абышлі ўвагай вучоныя і праблему суадносін ведаў і маральнага вопыту вучняў (В.С.Багданава, Д.І.Вадзінскі, Л.А.Высоціна).

Поспех працэсу маральнага выхавання, фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый залежыць і ад развіцця маральных пачуццяў, якія стымулююць, рэгулююць і карыгіруюць паводзіны. Гэта праблема таксама не засталася без увагі даследчыкаў. У працах псіхолагаў А.М.Лявонцьева /105; 106/, С.Л.Рубінштэйна /151; 152; 153/, П.В.Сіманава /166/ прааналізаваны псіхалагічныя механізмы фарміравання ўяўленняў аб маральных каштоўнасцях і маральных каштоўнасных арыентацыях. Шмат увагі вучоныя надаюць узбагачэнню матывацыйнай сферы суб'екта, яго маральным патрэбнасцям, якія пабуджаюць асобу да дзеяння праз розныя дыспазіцыйныя ўтварэнні, што ўяўляюць сабой сістэму фіксаваных установак. Узаемасувязь кагнітыўнага і эмацыянальнага ў структуры маральных каштоўнасных арыентацый, ролю пачуццяў і эмоцый у маральным выхаванні даследавалі А.Р.Кавалёў /91/, А.П.Марыненка /117/, Р.І.Цвяткова /195/, М.Г.Яноўская /218/ і інш.

У педагагічных даследаваннях звяртаецца ўвага на той факт, што кожны чалавек мае сваю індывідуальную іерархію маральных каштоўнасцей, якая аб'ядноўвае асобу з духоўнай культурай грамадства /35; 59; 61; 69; 79; 98/. У гэтай сістэме змест маральных каштоўнасцей грамадства распрадмечваецца кожным індывідам з улікам яго жыццевага доследу і ўзроўню духоўнага развіцця.

У большасці даследаванняў, прысвечаных праблеме маральных каштоўнасцей і маральных каштоўнасных арыентацый, вялікая ўвага надаецца маральнай ацэнцы як рэгулятару ў асэнсаванні набытага досведу /26; 35; 36; 80; 88; 139; 140/. Каштоўнасць набывае значнасць для асобы праз ацэнку. Гнасеалагічная функцыя яе зводзіцца да пазнання грунтоўнасці з'яў, прадметаў, да вызначэння іх ролі ў жыцці чалавека. Як сродак раскрыцця і ўсведамлення важнасці таго або іншага аб'екта, ацэнка выражае і фарміруе каштоўнасна-ацэначныя адносіны да рэчаіснасці, служыць задавальненню патрэбнасцей людзей. Якасці прадметаў і з'яў становяцца каштоўнасцямі пасля станоўчай ацэнкі іх асобай з пункту погляду адпаведнасці грамадскім і асабістым інтарэсам і патрэбнасцям.

Аналіз навуковай літаратуры дазволіў выявіць ступень распрацаванасці даследуемай праблемы, псіхолага-педагагічныя асновы фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый у працэсе вучэбнай і пазаўрочнай дзейнасці, вылучыць структурныя кампаненты маральных каштоўнасных

арыентацый /3; 10; 11; 24; 34; 35; 41; 52; 59; 60; 61; 69; 79; 81; 92; 97; 98; 116; 132; 137; 141; 143; 149; 154; 161; 194; 195; 197; 198; 199; 220/.

Структурна маральная каштоўнасная арыентацыя складаецца з трох кампанентаў: кагнітыўнага, функцыя якога заключаецца ў фіксацыі, абагульненні, сістэматызацыі інфармацыі; эмацыянальнага, які выконвае функцыю рэгуляцыі і карэкцыі; канатыўнага, які забяспечвае матывацыю і паводзіны. Усе гэтыя кампаненты грунтуюцца на пазнавальнай, ацэначнай і канатыўнай дзейнасці.

Педагагічная навука вылучае тры формы існавання маральных каштоўнасцей:

- маральны ідэал, выпрацаваны грамадскай свядомасцю;

- канкрэтныя дзеянні і ўчынкі, у якіх увасабляюцца грамадскія маральныя ідэалы;

- асабістыя маральныя каштоўнасці і маральны ідэал, якія з цягам часу ператвараюцца ў матывы паводзін і ўваходзяць у псіхалагічную структуру асобы.

Як сведчаць навуковыя дадзеныя, у працэсе фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вучняў асаблівае значэнне маюць прадметы гуманітарнага цыклу: гісторыя, літаратура, эстэтыка, выяўленчае мастацтва /52; 53; 59; 85; 92; 95/.

Каштоўным матэрыялам для педагагічнай навукі ў справе далучэння дзяцей да маральных каштоўнасцей, фарміравання ў іх маральных каштоўнасных арыентацый з'яўляецца вусная народная творчасць з яе багацейшым духоўным арсеналам. Як вядома, фальклор існаваў яшчэ да стварэння пісьмовых педагагічных крыніц і з'яўляўся адным з важнейшых сродкаў выхавання. Не адно пакаленне беларусаў зведала на сабе яго жыватворную сілу.

На працягу доўгіх стагоддзяў вусная народная творчасць фарміравала менталітэт народа, з'яўлялася крыніцай духоўнай культуры, з якой народ чэрпаў маральныя сілы.

Задачы фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вучняў у наш час набываюць асаблівую надзённасць. Яны атрымаюць станоўчае вырашэнне, калі сродкам у іх дасягненні стане фальклор.

Вышэй адзначаныя акалічнасці паслужылі асновай для распрацоўкі тэмы дысертацыйнага даследавання.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

*Актуальнасць даследавання* вызначаецца грамадскай патрэбнасцю ў фарміраванні сацыяльна актыўнай асобы, з устойлівай сістэмай маральных каштоўнасных арыентацый.

Дынаміка сацыяльна-палітычнага пераўладкавання грамадства, крызіс ідэалаў і каштоўнасцей садзейнічаюць перасэнсаванню асноў духоўнага жыцця народа, маральных арыенціраў. У гэтых умовах падрастаючае пакаленне застаецца найбольш неабароненым ад уплыву негатыўных фактараў. У той жа час менавіта ў падлеткавым узросце найбольш інтэнсіўна ідзе працэс фізічнага, сацыяльнага станаўлення асобы, ствараюцца перадумовы пачатку культурнай самаідэнтыфікацыі, уваходжання ў свет нацыянальнай культуры. Педагагічная думка актыўна шукае новыя шляхі да вырашэння ўзнікшай праблемы на аснове аксіялагічных падыходаў да працэсу маральнага выхавання. Асноўныя педагагічныя падставы фарміравання асобы падлеткаў- уключэнне яе ў сітуацыю выбару каштоўнасцей, іх асэнсаванне, маральна-матывіраваныя адносіны, дапамога ў ацэнцы і самаацэнцы сваіх дзеянняў, учынкаў.

Сучасная парадыгма выхавання прадугледжвае не навязванне тых або іншых каштоўнасцей, а стварэнне неабходных умоў для іх пазнання, разумення і выбару, стымуляцыю гэтага выбару і далейшую ўнутраную працу школьніка над сваімі ўчынкамі і дзеяннямі.

Педагагічныя аспекты праблемы фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый школьнікаў разглядаліся ў працах Д.І. Вадзінскага /35; 41/, К.У. Гаўрылавец /52; 53/, А.А. Грымаця /35; 59; 60; 61/, І.І. Казімірскай /53/, І.С. Мар'енка /119; 120/, І.Ф. Харламаў /192; 193/.

Пытанням вывучэння маральных каштоўнасных арыентацый асобных сацыяльных груп, арыентацыі іх на пэўныя каштоўнасці, карэкцыі маральных каштоўнасных арыентацый прысвечаны даследаванні А.Ю.Драбейніка /69/, Т.А.Канавалавай /97/.

Шэраг вучоных-даследчыкаў В.І.Казлоў /92/, М.С.Каган /84/, Б.Ц.Ліхачоў /111/, Б.М.Неменскі /125/, Б.П.Юсаў /211/ даследавалі праблему ўплыву мастацтва на маральнае развіццё асобы.

Шырокі спектр маральных каштоўнасцей для асобы прапаноўвае вусная народная творчасць. Сёння мы можам з упэўненасцю сцвярджаць, што шматвяковая народная традыцыя стварыла беспамылковую сістэму адбору і захавання найбольш каштоўнага і значнага з усяго таго, што было створана масавай мастацкай творчасцю.

Асаблівае гучанне ў беларускім фальклоры набыла маральная праблематыка. Існуюць агульначалавечыя маральныя каштоўнасці, якія не

могуць страціць свайго значэння, нягледзячы на ўсе грамадскія катаклізмы. Гэтыя каштоўнасці цудоўна адлюстраваны ў вуснай народнай творчасці. Арыентацыя на іх школьнікаў- важная задача школы ў сучасных умовах.

На педагагічныя ідэі, закладзеныя ў шматлікіх жанрах вуснай народнай творчасці, яшчэ ў XIX ст. звярталі ўвагу даследчыкі беларускага фальклору М.В.Доўнар-Запольскі /68/, Я.Ф.Карскі /89/, І.І.Насовіч /128/, М.Я.Нікіфароўскі /126; 127/, Е.Р.Раманаў /150/, А.К.Сержпутоўскі /163; 164/, П.В.Шэйн /204/, П.М.Шпілеўскі /208/ і інш. Гэтай праблеме прысвечана асобнае даследаванне А.Я.Багдановіча /27/. На выхаваўчыя магчымасці беларускіх казак, песень, прыказак, балад, легенд, паданняў звярталі ўвагу даследчыкі Г.А.Барташэвіч /16/, М.Я.Грынблат /62/, К.П.Кабашнікаў /82/, А.С.Ліс /110/, А.С.Фядосік /63/, І.К.Цішчанка /200/ і інш.

Сёння шырока разглядаюцца пытанні сутнасці і зместу, форм і метадаў выхавання сродкамі народнай педагогікі ў сістэме дашкольнага выхавання (А.А.Грымаць, Т.В.Паздзеева, Л.А.Панько і інш.). Змест народнай педагогікі, яе метады, сродкі ўздзеяння на асобу дзіцяці даследуе Г.П.Арлова /6/.

Разам з тым, праблема фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый сродкамі вуснай народнай творчасці даследавана недастаткова.

Зыходзячы з актуальнасці праблемы, яе сацыяльна-педагагічнай значнасці, была вызначана тэма нашага даследавання "Фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7 класаў сродкамі вуснай народнай творчасці".

*Аб'ект даследавання* - маральныя каштоўнасныя арыентацыі вучняў 5- 7 класаў.

*Прадмет даследавання* - працэс фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7 класаў сродкамі вуснай народнай творчасці.

*Мэта даследавання* - вывучыць маральныя каштоўнасныя арыентацыі падлеткаў, вызначыць аптымальныя шляхі і распрацаваць эфектыўныя формы іх карэкцыі, станаўлення і фарміравання сродкамі вуснай народнай творчасці.

Мэта канкрэтызавалася ў наступных *задачах*:

1. Абгрунтаваць патрабаванні да ўзроўняў сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7 класаў.

2. Распрацаваць і апрабіраваць методыку фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый сродкамі вуснай народнай творчасці.

3. Вывучыць патэнцыяльныя магчымасці факультатыўных заняткаў па вуснай народнай творчасці ў працэсе фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый.

4. Распрацаваць метадычныя рэкамендацыі для настаўнікаў па фарміраванні маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў сродкамі вуснай народнай творчасці.

Стан праблемы, характарыстыка аб'екта і прадмета, мэта і задачы даследавання дазволілі нам сфармуляваць наступную *гіпотэзу даследавання*:

- мэтавая накіраванасць факультатыўных заняткаў па вуснай народнай творчасці, пазакласная работа, пабудаваная з выкарыстаннем беларускага фальклору, беларускіх народных традыцый , садзейнічае паскарэнню працэсу фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў, іх станаўленню і развіццю;

- развіццё эмацыянальна-пачуццёвай сферы падлеткаў станоўча ўплывае на фарміраванне іх маральных каштоўнасных арыентацый сродкамі вуснай народнай творчасці;

- дзейнасны падыход у працэсе фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вызначае яго выніковасць.

*Метадалагічнай асновай даследавання* паслужылі палажэнні дыялектыкі аб сутнасці асобы як сукупнасці адносін, аб сацыяльнай дэтэрмінацыі паводзін асобы, аб сацыяльнай абумоўленасці фарміравання асобы школьніка і яе маральных каштоўнасных арыентацый.

Працэс фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7 класаў разглядаўся ў трох аспектах:

- філасофскім: аб дыялектыцы суадносін індывідуальнага, нацыянальнага і агульначалавечага як рэальных стасункаў філасофскіх катэгорый "агульнага, асаблівага і адзінкавага";

- псіхалагічным: аб актывізацыі пачуццёвай сферы асобы падлетка як пачаткавых дамінант, на якіх засноўваецца пабуджэнне да маральна насычанай дзейнасці;

- педагагічным: аб залежнасці працэсу фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый ад адзінства мэт, задач, зместу, форм, метадаў і сродкаў навучання і выхавання.

Для вырашэння пастаўленых задач і праверкі гіпотэзы выкарыстоўвалася комплексная методыка даследавання, якая ўключала ў сябе тэарэтычныя і эмпірычныя *метады*: вывучэнне і аналіз школьнай дакументацыі, мэтанакіраванае назіранне, анкетаванне, інтэрв'юіраванне, гутарку, сацыяметрычныя методыкі; аналіз педагагічнага вопыту і педагагічнай практыкі аўтара; псіхолага-педагагічны эксперымент; якасны аналіз статыстычных матэрыялаў.

Даследаванне праводзілася ў 4-ы этапы:

На 1-м этапе (1991- 1992гг.) вывучалася філасофская, псіхолага-педагагічная літаратура па тэме даследавання; удакладняўся змест асноўных паняццяў, якія звязаны з аб'ектам і прадметам даследавання, кампаненты, крытэрыі і паказчыкі ўзроўняў сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7 класаў; распрацоўвалася праграма і даследчая методыка эксперыментальнай работы, фармулявалася гіпотэза.

На 2-м этапе (1992- 1993гг.) былі вывучаны ўзроўні маральнай выхаванасці, сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў, вылучаны групы ў залежнасці ад узроўню сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый, створана даследчая група па праблеме.

На 3-м (1993- 1995гг.) праводзіўся фарміруючы этап эксперыменту, мэтай якога была праверка эфектыўнасці распрацаванай аўтарам методыкі ў адпаведнасці з вылучанай гіпотэзай.

На 4-м этапе (1995г.) праводзілася абагульняючая работа, аналізаваліся і сістэматызаваліся эксперыментальныя дадзеныя, удакладняліся і правяраліся атрыманыя вынікі даследча-эксперыментальнай работы, афармлялася дысертацыя.

*Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць даследавання* заключаюцца ў тым, што распрацаваны крытэрыі і паказчыкі сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7 класаў, выяўлены ўзроўні сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў. У даследаванні даказана, што прапанаваная методыка знаёмства з вуснай народнай творчасцю з'яўляецца дзейсным сродкам фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый школьнікаў у выпадку прытрымлівання педагагічных умоў, якія вызначаны ў працэсе эксперыменту.

*Практычнная значнасць даследавання* заключаецца ў распрацоўцы і апрабацыі методыкі вызначэння ўзроўняў сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый школьнікаў. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны і выкарыстоўваюцца ў рабоце настаўнікаў, пры чытанні лекцый, спецкурсаў, правядзенні спецсемінараў і практычных заняткаў на факультэтах беларускай філалогіі педВНУ, курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, у працэсе далейшага даследавання праблем удасканалення маральнага выхавання школьнікаў.

*Дакладнасць вынікаў даследавання* забяспечваецца навуковай метадалогіяй, сістэмай метадаў і методык, адэкватных задачам, аб'екту і прадмету даследавання; спалучэннем колькаснага і якаснага аналізаў; матэматычнай апрацоўкай эмпірычных дадзеных.

*Эканамічная значнаць* атрыманых вынікаў вымяраецца якаснымі змяненнямі ў структуры асабістай іерархіі маральных каштоўнасцей вучняў 5- 7 класаў.

Вынікі гэтых змяненняў непазбежна праявяцца ў жыццядзейнасці грамадства. Атрыманыя дадзеныя таксама будуць садзейнічаць больш хуткаму і эфектыўнаму вырашэнню праблем маральнага выхавання падлеткаў, адкрыццю новых перспектыў далейшага даследавання праблемы.

*Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону*:

1. Аксіялагічны разгляд маральных каштоўнасных арыентацый дазваляе вызначыць іх як інтэгратыўную характарыстыку асобы, у якой спалучаюцца кагнітыўны, эмацыянальны і канатыўны кампаненты.

2. У сістэме маральнага выхавання важная роля належыць вуснай народнай творчасці беларускага народа. Гэта абумоўлена тым, што працэс выхавання, які створаны народам, мае выключную выхаваўчую сілу, з якой не параўнаецца ніводная сістэма, заснаваная на абстрактных ідэях.

3. Працэс фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый грунтуецца на эмацыянальна насычаным успрыманні твораў вуснай народнай творчасці, асэнсаванні іх і практычнай рэалізацыіі засвоеных нормаў і прынцыпаў у штодзённых паводзінах.

4. Грунтоўнай заканамернасцю працэсу фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый з'яўляецца ўлік патрэбнасцей асобы і яе магчымасці ў маральным развіцці.

*Асабісты ўклад саіскальніка.* Дысертацыя ўяўляе сабой самастойную навуковую працу, якая абапіраецца на дасягненні вучоных і практыкаў Рэспублікі Беларусь, сусветнай псіхолага-педагагічнай навукі.

*Апрабацыя і ўкараненне вынікаў даследавання.* Асноўныя вынікі даследавання заслухоўваліся і абмяркоўваліся на кафедры педагогікі; навуковых канферэнцыях прафесарска-выкладчыцкага саставу (1994- 1995гг.); 1-й, 2-й, 3-й, 4-й навуковых канферэнцыях аспірантаў і маладых вучоных (г.Віцебск, 1993, 1994, 1995гг.); рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Навукова-тэарэтычная спадчына К.Д.Ушынскага і сучасныя праблемы развіцця педагагічнай навукі" (г.Віцебск, 1994г.); рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Праблема стварэння нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі педагагічных кадраў для дашкольных устаноў Рэспублікі Беларусь" (г.Мінск, 1994г.); міжнароднай канферэнцыі "Развіццё нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі педагагічных кадраў" (г.Мінск, 1994г.); рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Арганізацыя навукова-даследчай работы студэнтаў і навучэнцаў педагагічных навучальных устаноў" (г.Мінск, 1995г.).

*Апублікаванасць вынікаў.* Матэрыялы даследавання знайшлі адлюстраванне ў 10 публікацыях аўтара ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый.

*Структура і аб'ём дысертацыі.* Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, дзвюх глаў, вывадаў і 6 дадаткаў. У ёй змяшчаецца 149 старонак, 20 табліц і 11 малюнкаў. Спіс выкарыстаных крыніц уключае ў сябе 221 найменне.